**П. Панамарэнка**

**Сакратар ЦК КП(б)Беларусі**

# Год новага жыцця вызваленага народа

Адзін год аддзяляе нас ад гістарычных верасеньскіх дзён, калі гераічная Чырвоная Армія, выконваючы волю совецкага народа, вызваліла адзінакроўных братоў-беларусаў ад іга польскіх памешчыкаў і капіталістаў, і крыху менш года з таго гістарычнага дня, калі Народнае Сабранне Заходняй Беларусі аднадушна дэкларыравала ўстанаўленне совецкай улады—улады рабочых і сялян.

Найвялікшае значэнне падзей верасня 1939 года для Беларусі заключаецца ў тым, што ў выніку гэтых падзей адбылося з'яднанне ўсяго беларускага народа ў адзінай дзяржаве. Беларуская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка як па тэрыторыі, так і па насельніцтву вырасла ўдвая і ператварылася ў рэспубліку з 10,5-мільённым насельніцтвам, пераўзыходзячую па колькасці насельніцтва і тэрыторыі многія існаваўшыя і існуючыя еўрапейскія дзяржавы. Народы Заходняй Беларусі былі выратаваны ад пагражаўшага ім разбурэння і знішчэння, атрымалі палітычнае і нацыянальнае вызваленне, навекі пазбавіліся ад дзікага свавольства з боку польскіх памешчыкаў і капіталістаў.

Дзякуючы верасеньскім падзеям задаволены кроўныя інтарэсы працоўных мас, назаўсёды ліквідавана памешчыцкае землеўладанне, землі памешчыкаў, манастыроў і буйных дзяржаўных чыноўнікаў з усім іх жывым і мёртвым інвентаром і сядзібнымі пабудовамі канфіскаваны без усякага выкупу, сталі агульнанародным здабыткам.

Беларускі народ атрымаў магчымасць пазбавіць фабрыкантаў, заводчыкаў, банкіраў іх улады над працоўным народам, нацыяналізаваўшы на ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі буйную прамысловасць і банкі.

Вызваленыя народы Заходняй Беларусі атрымалі магчымасць будаваць сваё жыццё, карыстаючыся ўсімі выгадамі Сталінскай Канстытуцыі, зацвердзіўшай у якасці непахіснай асновы совецкага грамадства соцыялістычную ўласнасць на прылады і сродкі вытворчасці, соцыялістычную сістэму гаспадаркі, атрымалі правы, замацаваныя ў законадаўчым парадку Сталінскай Канстытуцыяй,—права на працу, на адпачынак, на забеспячэнне ў старасці, на асвету.

Год новага жыцця вызваленага народа быў годам вялікіх соцыяльных пераўтварэнняў, годам бурнага развіцця прамысловасці, перабудовы сельскай гаспадаркі і развіцця народнай культуры і мастацтва, годам бурнага росту палітычнай і працоўнай актыўнасці і далучэння працоўных мас да кіравання дзяржавай.

Новыя соцыяльныя адносіны між людзьмі, велізарныя змяненні ў жыцці працоўных мас, магутная сіла перамогі соцыялізма ў нашай краіне з'явіліся крыніцай найвялікшага ўздыму палітычнай актыўнасці і вытворчага энтузіязма. Заходняя Беларусь да з'яднання адстала ў сваім развіцці настолькі, што ўзровень яе прамысловай прадукцыі аказаўся ў 9 разоў ніжэй, чым у Беларускай ССР. Соцыялістычная

сістэма гаспадаркі за адзін год зусім змяніла аблічча прадпрыемстваў прамысловасці. Прадпрыемствы расшыраны, тэхнічна аснашчоны, механізіраваны, вышлі з застою.

За прайшоўшы год створаны новыя прадпрыемствы мясцовай, будаўнічай, харчовай, керамічнай, лесаапрацоўчай і іншых галін прамысловасці. Аб'ём валавой прадукцыі на прадпрыемствах у параўнанні з 1938 годам павялічыўся на 195,7 проц. Здабыча торфу ўзрасла ва многа разоў. Выпуск шарсцяных тканін павялічыўся на 169,2 проц., скуранога абутку—на 243,5 проц., выраб запалак—на 351,4 проц. У некалькі разоў павялічылася вытворчасць сельскагаспадарчых машын. Значна ўзрасла вытворчасць культурна-бытавых тавараў; выпуск веласіпедаў на рэканструіруемым Гродненскім заводзе павялічыўся ў два разы.

Будуюцца дзесяткі новых харчовых прадпрыемстваў. Магутнасць толькі аднаго хлебазавода ў Беластоку складае 60 тон хлеба ў суткі, што перавышае магутнасць 90 прыватных пякарань. Расшыраюцца лесапільныя заводы. Створаны фабрыкі па вырабу мэблі.

Рэканструіруецца, тэхнічна пераўзбройваецца і па сутнасці нанава ствараецца тэкстыльная прамысловасць. Совецкі Беласток ператвараецца ў буйны цэнтр тэкстыльнай прамысловасці Саюза. Ужо створаны 32 буйныя тэкстыльныя прадпрыемствы. На рэканструкцыю тэкстыльнай прамысловасці будзе затрачана 56 млн. рублёў. Пры панаванні капіталістаў тэкстыльная прамысловасць Беластока давала 5—6 млн. метраў тканіны ў год. У гэтым годзе яна ўжо дала 10,5 млн. метраў, да канца года дасць звыш 13 млн. метраў, а ў 1941 годзе—15—16 млн. метраў.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы**